Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

*Праграма для студэнтаў*
(спецыяльнасць“харэаграфічнае мастацтва”)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2003

Праграму распрацавалі дацэнт **В.В.Лысянкова**, ст. выкладчык **В.П.Бяляева**, ст. выкладчык **А.М.Шылкіна**

Рэцэнзенты

доктар мастацтвазнаўства, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі **Ю.М.Чурко**; дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, народная артыстка Рэспублікі Беларусь **Л.Г.Бржазоўская**

Праграма зацверджана на пасяджэнні вучэбна-метадычнай рады Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры (пратакол № 4 ад 24.12.2002 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Прадмет “Методыка выкладання спецдысцыплін” з’яўляецца складанай часткай агульнага працэсу навучання студэнтаў — будучых выкладчыкаў харэаграфічных дысцыплін.

Асноўнай задачай курса з’яўляецца набыццё студэнтамі ведаў у вобласці тэорыі і методыкі выкладання харэаграфічных дысцыплін, а таксама вывучэнне метадычнай літаратуры, неабходнай для асваення класічнага, народна-сцэнічнага танцаў, мастацтва балетмайстра.

Праграма разлічана на адзін навучальны семестр, прадугледжвае засваенне матэрыялу ў аб’ёме 20 гадзін і складаецца з лекцыйных і семінарскіх заняткаў.

Прадмет “Методыка выкладання спецдысцыплін” адносіцца да гуманітарнага профілю падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне харэаграфічнага мастацтва, які прадугледжвае атрыманне прафесійнай кваліфікацыі “артыст народнага танца”. Выкладчык (балетмайстар) танца”.

Сферы прафесійнай дзейнасці спецыяліста на аснове агульнанавуковых і спецыяльных ведаў наступныя:

— выканаинне пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў галіне харэаграфіі;

— выкладанне спецыяльных дысцыплін для ўсіх узроставых катэгорый;

— выкладанне класічных, народна-сцэнічных танцаў;

— работа ў якасці балетмайстра з выканаўцамі;

— артыстычная дзейнасць.

Студэнт, авалодваючы ведамі па курсе “Методыка выкладання спецдысцыплін”, павінен умець:

— выкладаць спецыяльныя дысцыпліны для ўсіх узроставых катэгорый;

— здзяйсняць пастановачную і рэпетыцыйную работу ў галіне харэаграфіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— інтэрпрэтаваць рэгіянальныя асаблівасці беларускай і іншых народнасцей танцавальных культур;

—ажыццяўляць эксперыментальную дзейнасць у прафесійнай сферы, вызначаць тэндэнцыі развіцця харэаграфічнага мастацтва.

Курс завяршаецца залікам, дзе студэнты павінны прадэманстраваць узровень ведаў у вобласці харэаграфічнага мастацтва, асноўных этапаў яго гісторыі і развіцця, спецыяльнай літаратуры і тэрміналогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы разделаў тэм | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем |
| **Раздзел I. Класічны танец** | | | |
| 1. Паняцце “класічны танец”. Асноўныя выразныя сродкі класічнага танца | 1 | - | - |
| 2. Развіццё і станаўленне школы класічнага танца. Кніга А.Я. Ваганавай “Асновы класічнага танца”. Педагагічная сістэма А.Я.Ваганавай | 2 | 1 | 1 |
| 3. Уклад В.Кастравіцкай, А.Пісарава, Н.Базарава, В.Мэй, М.Тарасава ў развіццё і ўзбагачэнне тэорыі і методыкі выкладання класічнага танца | 1 | 1 | - |
| 4. Методыка пабудовы ўрока класічнага танца (у харэаграфічных калектывах розных кірункаў — народным, эстрадным, бальным) | 1 | 1 | - |
| 5. Развіццё музыкальнасці на ўроках класічнага танца. Музычнае суправаджэнне ўрокаў класічнага танца | 1,5 | 1 | 0,5 |
| 6. Работа выкладчыка-харэографа ў класе. Этапы падрыхтоўкі выкладчыка да правядзення ўрока класічнага танца ў калектывах рознай накіраванасці і ў розных узроставых групах | 1,5 | 1 | 0,5 |
| Усяго... | 8 | 6 | 2 |
| **Раздзел II. Народна-сцэнічны танец** | | | |
| 7. Вытокі і развіццё народна-сцэнічнай харэаграфіі | 2 | 1,5 | 0,5 |
| 8. Методыка і асаблівасці пабудовы ўрока народна-сцэнічнага танца ля станка | 1,5 | 1 | 0,5 |
| 9. Методыка і асаблівасці выкладання народна-сцэнічнага танца на сярэдзіне залы | 1,5 | 1 | 0,5 |
| 10. Прынцып падбору музычнага матэрыялу для суправаджэння ўрокаў народна-сцэнічнага танца | 1 | 1 | - |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| 11. Этапы падрыхтоўчай работы выкладчыка да правядзення ўрокаў народна-сцэнічнага танца | 1 | 0,5 | 0,5 |
| 12. Асаблівасці выкладання народна-сцэнічнага танца ў розных харэаграфічных структурах (харэаграфічных школах, школах мастацтваў, вучылішчах мастацтваў, ВНУ) | 1 | 1 | |
| Усяго... | 8 | 6 | 2 |
| **Раздзел III. Мастацтва балетмайстра** | | | |
| 13. Прадмет, асноўныя катэгорыі і задачы курса “Мастацтва балетмайстра” | 1 | 1 | - |
| 14. Балетмайстар і сфера яго педагагічнай і творчай дзейнасці ў харэаграфічным калектыве | 2 | 1 | 1 |
| 15. Педагагічныя патрабаванні да арганізацыі працэсу навучання харэаграфічнаму мастацтву з улікам узроставых і індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў | 0,5 | 0,5 | - |
| 16. Асаблівасці арганізацыі канцэртнай дзейнасці ў харэаграфічным калектыве (народным, бальным, эстрадным) | 0,5 | 0,5 | - |
| 17. Асаблівасці арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы ў дзіцячым харэаграфічным калектыве | 1 | 1 | - |
| 18. Методыка пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў дзіцячым харэаграфічным калектыве | 3 | 2 | 1 |
| **Усяго** | 8 | 6 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### РАЗДЗЕЛ I. Класічны танец

*Тэма 1. Паняцце класічнага танца. Асноўныя выразныя сродкі класічнага танца*

Класічны танец — гістарычна склаўшаяся, устойлівая сістэма выразных сродкаў харэаграфічнага мастацтва, заснаваная на прынцыпе паэтычна-абагуленай трактоўкі сцэнічнага вобраза, якая сфарміравалася на працягу шматлікіх стагоддзяў і ў многіх народаў.

Асноўныя выразныя сродкі, патрабаванні класічнага танца, вываратнасць, пастава, скачок, музыкальнасць і інш.

*Тэма 2. Развіццё і станаўленне школы класічнага танца. Кніга А.Я.Ваганавай "Асновы класічнага танца". Педагагічная сістэма А.Я.Ваганавай*

Стварэнне тэорыі класічнага танца. Спалучэнне тэорыі і практыкі. Сістэматызацыя рухаў класічнага танца. Стварэнне падручніка "Асновы класічнага танца".

Новая методыка выкладання класічнага танца як аналіз усяго лепшага з айчыннай класічнай школы.

*Семінар.*

*Тэма 3. Уклад В.Кастравіцкай, А.Пісарава, Н.Базарава, В.Мэй, М.Тарасава ў развіццё і ўзбагачэнне тэорыі і методыкі выкладання класічнага танца*

Развіццё і ўзбагачэнне тэорыі і методыкі класічнага танца педагогамі Ленінградскага і Маскоўскага харэаграфічных вучылішчаў. Аналіз літаратуры па методыцы выкладання класічнага танца ("Асновы класічнага танца" А.Я.Ваганавай; "Класічны танец" М.Тарасава; "Азбука класічнага танца" Н.Базарава, В.Мэй; "Школа класічнага танца" В.Кастравіцкай, А.Пісарава).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Методыка пабудовы ўрока класічнага танца (у харэаграфічных калектывах розных кірункаў - народным, эстрадным, бальным)*

Састаўныя часткі ўрока класічнага танца, іх падпарадкаванне пэўнай задачы і зместу. Значэнне правільнага выбару тэмпу правядзення ўрока ад пачатку да канца, кожнай яго часткі, камбінацыі. Суразмернасць працягласці частак урока. Методыка сачынення вучэбных танцавальных камбінацый. Асаблівасці пабудовы ўрока А.Я.Ваганавай і А.Месэрэрам.

*Тэма 5. Развіццё музыкальнасці на ўроках класічнага танца. Музычнае суправаджэнне ўрокаў класічнага танца*

Узаемасувязь музыкі і танцавальных вучэбных камбінацый на ўроках класічнага танца. Развіццё музыкальных здольнасцей, уяўлення аб класічнай музыцы, станаўленне мастацкага густу на ўроках класічнага танца. Вобразна-эмацыянальная і інтанацыйная адпаведнасць музыкі і танцавальных камбінацый. Метрарытмічная ўзаемасувязь музыкі і харэаграфіі.

*Семінар.*

*Тэма 6. Работа выкладчыка-харэографа ў класе. Этапы падрыхтоўкі выкладчыка да правядзення ўрока класічнага танца ў калектывах рознай накіраванасці і ў розных узроставых групах*

Зместам харэаграфічнай адукацыі з’яўляецца авалоданне і развіццё высокай культуры харэаграфічнай выканальніцкай тэхнікі, набыццё ведаў аб музыцы і руху, фарміраванне сістэмы поглядаў на мастацтва харэаграфіі.

Задача педагога — падрыхтаваць вучня да ўспрымання асноў харэаграфіі, выхаваць культуру рухаў, каб затым ён змог перадаваць і ўвасабляць у танцы эмоцыі і пачуцці вобразаў, характары.

*Семінар.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РАЗДЗЕЛ II. Народна-сцэнічны танец

*Тэма 7. Вытокі і развіццё народна-сцэнічнай харэаграфіі*

Народны танец як від мастацтва харэаграфіі. Паняцце “танцавальны фальклор”.

Росквіт многанацыянальнага мастацтва народнага танца ў савецкія гады.

Народны танец — аснова творчай дзейнасці харэаграфічнага калектыву.

*Семінар.*

*Тэма 8. Методыка і асаблівасці пабудовы ўрока народна-сцэнічнага танца ля станка*

Спецыфіка пазіцый рук, ног, пастаноўка корпуса, становішча галавы і плячэй.

Рухі ля станка — аснова для авалодання мастацтвам выканання народна-сцэнічнага танца.

Асноўныя рухі ля станка; назвы рухаў; характар музычнага суправаджэння; паказ рухаў, іх прызначэнне і характар; правілы выканання ў спалучэнні з музычным суправаджэннем; асноўныя этапы вывучэння рухаў ля станка.

*Семінар.*

*Тэма 9. Методыка і асаблівасці выкладання народна-сцэнічнага танца на сярэдзіне залы*

Асноўныя задачы і прынцыпы адбору танцавальнага матэрыялу для заняткаў на сярэдзіне залы.

Выхаванне тэхнікі выканання элементаў і рухаў жаночага і мужчынскага народна-сцэнічнага танца.

Значэнне эцюднай работы ў выхаванні манеры выканання нацыянальных танцаў.

Вядучыя педагогі народна-сцэнічнага танца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дапаможная літаратура па народна-сцэнічным танцы.

*Семінар.*

*Тэма 10. Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу для суправаджэння ўрокаў народна-сцэнічнага танца*

Асноўныя прынцыпы–вобразна-эмацыянальная і нацыянальная адпаведнасць музыкі і харэаграфіі на ўроках народна-сцэнічнага танца.

Метрарытмічная ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць музыкі і танца.

Выкарыстанне фанаграм.

*Тэма 11. Этапы падрыхтоўчай работы выкладчыка да правядзення ўрока народна-сцэнічнага танца*

Дыягностыка. Прагназаванне. Праектаванне.

Выкарыстанне праграмы, каляндарны план, падрыхтоўчы план будучага ўрока.

Работа з канцэртмайстрам.

*Семінар.*

*Тэма 12. Асаблівасці выкладання народна-сцэнічнага танца ў розных харэаграфічных структурах (харэаграфічных школах, школах мастацтваў, вучылішчах мастацтваў, ВНУ)*

Дасканальнае веданне вучэбнай праграмы. Карэкціроўка вучэбнай праграмы з улікам магчымасцей навучэнцаў.

Валоданне метадамі і прыёмамі падачы вучэбнага матэрыялу.

## РАЗДЗЕЛ ІІІ. Мастацтва балетмайстра

*Тэма 13. Прадмет, асноўныя катэгорыі і задачы курса "Мастацтва балетмайстра"*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Мастацтва балетмайстра” як прадмет, яго ўплыў на фарміраванне вобразнага мыслення, асноўныя мэты і задачы курса. Дысцыпліна “Мастацтва балетмайстра”, яе ўзаемасувязь з тэорыяй і методыкай выкладання сумежных дысцыплін (класічным, народна-сцэнічным, гісторыка-бытавым, сучасным эстрадным танцам і інш.).

Асноўныя катэгорыі і выразныя сродкі харэаграфічнага твора (музыка, драматургія, малюнак, лексіка).

Музыка як інтанацыйна-выразная і структурна-арганізуючая аснова харэаграфічнай кампазіцыі.

Драматургія як ідэйна-зместавая аснова харэаграфічнай кампазіцыі.

*Тэма 14. Балетмайстар і сфера яго педагагічнай і творчай дзейнасці ў харэаграфічным калектыве*

Прафесія “балетмайстар”. Балетмайстар як мастацкі кіраўнік, рэжысёр-пастаноўшчык і арганізатар харэаграфічнага калектыву.

Балетмайстар як педагог-выхавацель і псіхолаг харэаграфічнага калектыву.

Балетмайстар як стваральнік, пастаноўшчык і рэпетытар танцавальных твораў.

Асноўныя прынцыпы выхавання балетмайстра.

*Семінар.*

*Тэма 15. Педагагічныя патрабаванні да арганізацыі працэсу навучання харэаграфічнаму мастацтву з улікам узроставых і індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў*

Неабходныя ўмовы для паспяховай работы дзіцячага харэаграфічнага калектыву.

Улік узроставых і індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў у арганізацыі працэсу навучання харэаграфічнаму мастацтву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя педагагічныя патрабаванні да арганізацыі працэсу навучання (рэгулярнасць правядзення заняткаў; выхаванне свядомых і паважлівых адносін да танцавальнага мастацтва і інш.).

*Тэма16. Асаблівасці арганізацыі канцэртнай дзейнасці ў харэаграфічным калектыве (народным, бальным, эстрадным)*

Канцэрт — вышэйшая форма праяўлення творчых дасягненняў калектыву.

Асноўныя прынцыпы арганізацыі канцэртнай дзейнасці харэаграфічнага калектыву.

Стварэнне рознатэматычных сцэнічных праграм — адна з неабходных умоў паспяховай канцэртнай дзейнасці калектыву.

Рэгулярнасць канцэртных выступленняў.

Сувязь калектыву з рознымі ўстановамі культуры і мастацтва для ажыццяўлення канцэртнай дзейнасці.

Выхаванне ў удзельнікаў калектыву ўменняў і навыкаў для выступленняў на розных сцэнічных пляцоўках.

Улік творчых магчымасцей калектыву ў арганізацыі яго канцэртнай дзейнасці.

Удзел у фестывалях і конкурсах як важны стымул творчага развіцця танцавальнага калектыву.

*Тэма 17. Асаблівасці арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы ў дзіцячым харэаграфічным калектыве*

Асноўныя прынцыпы вучэбна-выхаваўчай работы з дзецьмі ў харэаграфічным калектыве.

Трэнаж — аснова дзейнасці харэаграфічнага калектыву. Развіццё асноўных навыкаў танцавальнай тэхнікі — галоўная задача трэнажу.

Дыферэнцыраваны падыход да трэнажу (улік узроставых асаблівасцей удзельнікаў калектыву). Сувязь вучэбна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га матэрыялу з танцавальнымі рухамі з рэпертуару калектыву — неабходная ўмова падтрымкі інтарэсу дзяцей да заняткаў трэнажом.

Музычнае выхаванне ўдзельнікаў калектыву.

Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу з улікам узроставых асаблівасцей.

Формы і метады выхаваўчай работы ў дзіцячым харэаграфічным калектыве.

*Тэма 18. Методыка пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў дзіцячым харэаграфічным калектыве*

Спецыфіка работы балетмайстра па стварэнні праграмы на аснове літаратурнага, гістарычнага, іконаграфічнага, фальклорнага, вусна-паэтычнага і іншых крыніц.

Балетмайстар як рэжысёр, лібрэтыст і драматург.

Праграма, лібрэта, кампазіцыйны план харэаграфічнага твора.

Праграма — аснова для стварэння кампазіцыйнага плана.

Кампазіцыйны план — падрабязны разгорнуты сцэнарый танцавальнай кампазіцыі.

Пабудова сюжэта харэаграфічнага твора па законах драматургіі, асноўныя этапы яго развіцця.

*Семінар.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС
## рэкамендаванай літаратуры


*Класічны танец*

**Базарова Н.** Классический танец. — Л.: Искусство, 1975. — 204 с.

**Базарова Н., Мей В.** Азбука класического танца. — Л.: Искусство, — 1983. — 200 с.

**Ваганова А.** Основы классического танца. — Л.: Искусство, 1980. — 177 с.

**Костровицкая В., Писарев А**. Школа классического танца. — Л.: Искусство, 1986. — 271 с.

**Лысенкова В.В.** Классический танец. — Мозырь: Белый ветер, 2000. — 471 с.

**Тарасов Н.** Классический танец. — М.: Искусство, 1981. — 493 с.

**Ярмолович Л.** Принципы музыкального оформления урока классического танца. — М.: Искусство, 1968. — 682 с.

**Балет:** Энциклопедия. — М.: Советская энциклопедия, 1981. — 623 с.

*Народна—сцэнічны танец*
*Асноўная літаратура*

**Васільева Е.** Танец: Учеб. пособие для театральных вузов. –М.: Искусство, 1968.

**Зайцев Э.** Основі народно-характерного танцю. — Киев, — 1975. — 222 с.

**Зацепина К., Климов А., Толстая М., Рихтер К., Фарманяни Е.** Народно-сценический танец: Учеб.метод. пособие для средних специальных и высших учебных заведений искусств и культуры. — М.: Искусство, 1976.

**Климов А.** Основы русского народного танца: Учебник для студентов хореографических отделений ин-тов культуры, балетмейстерских фактов, театральных ин—тов


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

и учащихся хореографических училищ. — М.: Искусство, 1981.

**Лопухов А., Ширяев А., Бочаров М.** Основы характерного танца. — Л.; М.: Искусство, 1939.

**Ткаченко Т**. Народные танцы: болгарские, венгерские, немецкие, польские, румынские, сербские, хорватские, чешские и словацкие. — М.: Искусство, 1975.

*Дадатковая літаратура*

**Барышникова Г.** Азбука хореографии. — М.: Айрис-Пресс, 1999.

**Захаров Р.** Сочинение танца. Страницы педагогического опыта. — М.: Искусство, 1989.

*Мастацтва балетмайстра*

*Асноўная літаратура*

**Алексютович Л.** Белорусские народные танцы, хороводы, игры. — Мн.: Вышэйш. школа, 1978. — 527 с.

**Гребенщиков С.** Белорусская народно-сценическая хореография. — Мн.: Наука и техника, 1976. — 248 с.

**Гребенщиков С.** Белорусские танцы. — Мн.: Наука и техника, 1987. — 240 с.

**Захаров Р.** Искусство балетмейстера. — М.: Искусство, 1954. — 428 с.

**Захаров Р.** Записки балетмейстера. — М.: Искусство, 1976. — 397 с.

**Захаров Р.** Сочинение танца. — М.: Искусство, 1983. — 270 с.

**Смирнов И.** Искусство балетмейстера. — М.: Просвещение, 1986. — 190 с.

**Чурко Ю.М.** Белорусский сценический танец. — Мн.: Наука и техника, 1969. — 135 с.

**Чурко Ю.М.** Белорусский народный танец. — Мн.: Наука и техника, 1972. — 192 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Чурко Ю.М.** Белорусский хореографический фольклор. — Мн.: Вышэйш. школа, 1990. — 144 с.

*Дадатковая літаратура*

**Голейзовский К.** Образы русской народной хореографии. — М.: Искусство, 1964. — 324 с.

**Захаров Р.** Слово о танце. — М.: Молодая гвардия, 1977.

**Захаров Р.** Работа балетмейстера с исполнителем.— М. Искусство, 1956. — 60 с.

**Настюков Г.** Народный танец на самодеятельной сцене. — М.: Профиздат, 1976. — 62 с.

**Новерр Ж.** Письма о танце. — Л.: Искусство, 1965.

**Фокин М.** Против течения. — М.; Л..: Искусство, 1962. — 638 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбнае выданне

**Методыка выкладання спецдысцыплін**

Праграма курса

Рэдактары І.В.Смяян, Л.Ц.Спірыдонава

Падп. у друк. 2003 г. Фармат 60х84 1/16.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. .
Ул.-выд. арк. . Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржыўны універсітэт культуры
220001, г.Мінск, вул. Рабкораўская, 17
Ліцэнзія ЛВ № 283 ад 22.04.1998 г.

Надрукавана на ратапрынце
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры
220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17
Ліцэнзія ЛП № 496 ад 25.06.2002 г.